*Мы—інтэрнацыяналісты*

# МОЦНЫЯ ДРУЖБАЙ







У чарговы раз клуб інтэрнацыянальнай дружбы Бранскага педагагічнага інстытута імя акадэміка Пятроўскага сабраў сваіх сяброў — інтэрклубаўцаў многіх ВНУ краіны: «Юнацтва планеты» (БІЧТ), Вільнюскага педінстытута, Рыжскага інстытута фізічнай культуры, Косаўскага тэхнікума мастацкіх промыслаў (Украіна), Бакінскага і Кутаіскага політэхнічных інстытутаў, Гомельскага дзяржаўнага універсітэта.

На вакзале нас сустракалі гаспадары. Праз паўгадзіны перад намі расчыніліся дзверы інстытута гасцінных гаспадароў. За тры дні знаходжання ў Бранску мы паспелі ўбачыць і даведацца аб многім. Многае тут было незвычайным для нас, павучальным. Напрыклад, тое, што гаспадары прымалі нас у студэнцкім кафэ, якое пабудавалі сваімі рукамі. На вечары знаёмства выступілі ўсе дэлегацыі. Гучалі вершы, песні на мовах розных народаў. Беларускія песні гучалі ў выкананні нашай Ірыны Марчанка.

У гэты вечар мы таксама пабывалі і на дыскатэцы «Рэзананс-1» — пераможцы ўсесаюзнага конкурсу дыскатэк ВНУ.

На другі дзень нас чакала экскурсія па інстытуту. Мы наведалі музей гісторыі інстытута, аўдыторыі і лабараторыі факультэтаў.

Пасля экскурсіі па інстытуту адправіліся ў музей крыштальнага завода ў горадзе Дзяцькаве. Наогул сам горад Дзяцькава і гэты раён вельмі цікавыя: у гады Вялікай Айчыннай вайны тут не было ворагаў. На тэрыторыі раёна існавала Савецкая ўлада, працавалі калгасы і саўгасы. Гэта быў сапраўдны партызанскі край.

Наведанне музея было вельмі цікавым. Прыгажосць твораў рук чалавечых, фантазія— усё гэта ўражвае. Экспазіцыі музея расказваюць аб развіцці айчыннай вытворчасці крышталю.

Чарговым мерапрыемствам таго ж дня і галоўным для ўсёй нашай сустрэчы быў семінар па абмену вопытам. На семінары выступілі прадстаўнікі ўсіх дэлегацый. Яны расказвалі аб рабоце сваіх клубаў, яе формах і метадах, аб сістэме прыёму ў клуб.

У апошні дзень нас чакала яшчэ адна экскурсія — на партызанскую паляну. На тэрыторыі мемарыяльнага комплексу — «Партызанская паляна» можна ісці толькі пешшу — тут зона цішыні... Высокая стэла, якая формай нагадвае прыспушчаны сцяг. На паўкруглай сцяне навечна запісаны імёны сямісот трох партызан з горада Бранска, якія загінулі ў баях за родную зямлю. На стэле надпіс: «Тут у верасні 1941 года партызанамі бранскіх атрадаў імя Краўцова і раённага быў узняты сцяг свяшчэннай барацьбы за гонар і незалежнасць нашай Айчыны». У музеі партызанскай славы захоўваюцца дакументы аб партызанскіх атрадах, якія пачыналі свой баявы шлях у бранскіх лясах.

Гаспадары пазнаёмілі нас і са сваім горадам — ардэнаносным Бранскам.

Шмат цікавага было ў гэтыя дні, але самае галоўнае — у нас з'явілася шмат новых сяброў. Мы пазнаёміліся з традыцыямі і вопытам, прывезлі новыя гульні, песні. А яшчэ мы засталіся ўпэўненымі ў тым, што мы вельмі моцныя дружбай.

**Людміла ЦАРОВА,**
**прэзідэнт Клуба інтэрнацыянальнай дружбы «Саюз».**

**НА ЗДЫМКАХ: ля мемарыяльнага комплексу «Партызанская паляна»; у музеі гісторыі Бранскага педагагічнага інстытута; лепшыя творы дзяцькаўскіх майстроў.**

Фота Л. Царовай
і А. Серыкава.

# ХАРЧОВАЯ ПРАГРАМА—СПРАВА

**Камуністы, усе савецкія людзі з велізарным задавальненнем і натхненнем успрынялі рашэнні майскага (1982 года) Пленума ЦК КПСС, даклад Генеральнага сакратара ЦК КПСС таварыша Л. І. Брэжнева «Аб Харчовай праграме СССР на перыяд да 1990 года і мерах па яе рэалізацыі».**

**У партыйных арганізацыях, калектывах працоўных шырока разгортваецца лекцыйная і масава-палітычная работа па растлумачэнню і прапагандзе дакументаў Пленума ЦК КПСС, Харчовай праграмы. У чэрвені г. г. усюды адбудуцца адзіныя палітдні.**

**У дапамогу арганізатарам грамадска-палітычных чытанняў, адзіных палітдзён, дакладчыкам, лектарам, прапагандыстам, палітінфарматарам і агітатарам публікуецца ПРЫКЛАДНАЯ ТЭМАТЫКА выступленняў.**

Даклад Л. І. Брэжнева на майскім Пленуме ЦК КПСС— баявая праграма работы партыі і народа.

Гістарычнае значэнне майскага Пленума ЦК КПСС.

Харчовая праграма СССР — канкрэтная рэалізацыя рашэнняў XXVI з'езда КПСС.

Вынікі развіцця сельскай гаспадаркі пасля сакавіцкага (1965 г.) Пленума ЦК КПСС.

Глыбокія перамены ва ўмовах жыцця і працы савецкага сялянства.

Забеспячэнне насельніцтва краіны прадуктамі харчавання —актуальная эканамічная і сацыяльна-палітычная задача.

Харчовая праграма — прынцыпова новы крок у сістэме планавання.

Харчовая праграма — важнейшая частка эканамічнай стратэгіі партыі на бліжэйшае дзесяцігоддзе.

Харчовая праграма — гэта канкрэтныя клопаты аб людзях, аб савецкім чалавеку.

Мэтавы, комплексны падыход да вырашэння харчовай праблемы.

Харчовая праграма СССР і шляхі яе рэалізацыі.

Харчовая праграма нашай рэспублікі (краю, вобласці, раёна).

Сацыяльная перабудова вёскі — арганічная частка Харчовай праграмы.

Сціранне сацыяльных адрозненняў паміж горадам і вёскай.

Добрасумленная праца —аснова нашага дабрабыту.

Узаемазвязанае, збалансаванае развіццё аграпрамысловага комплексу.

Далейшае развіццё сельскай гаспадаркі — зыходная база кардынальнага вырашэння харчовай праблемы.

Інтэнсіфікацыя — ключ да павышэння эфектыўнасці сельскай гаспадаркі.

Настойліва ўкараняць навукова абгрунтаваную сістэму земляробства.

Нарыхтоўкам прадуктаў земляробства і жывёлагадоўлі — неаслабную ўвагу.

Зямля — галоўнае прыроднае багацце.

Нарошчванне вытворчасці збожжа — ключавая праблема.

Галоўнае сёння і заўтра — павышэнне ўраджайнасці палёў.

Парадуем Радзіму высокім ураджаем у юбілейным годзе.

Забяспечым рост вытворчасці пладоў, агародніны, бульбы.

Жывёлагадоўля — ударны фронт.

Роля навукі ў рэалізацыі Харчовай праграмы.

Дасягненні перадавікоў — кожнай гаспадарцы.

Комплексная механізацыя сельскай гаспадаркі.

Жывеш у вёсцы — ведай, любі і беражы тэхніку.

Транспартнае забеспячэнне аграпрамысловага комплексу.

Будаўніцтву дарог у вёсцы — павышаную ўвагу.

Развіццё харчовых галін прамысловасці.

Гарантаваць устойлівае забеспячэнне насельніцтва ўсімі відамі прадуктаў харчавання.

Прадукцыі земляробства і жывёлагадоўлі — высокую якасць.

Выкарыстаем мясцовыя магчымасці для захоўвання і перапрацоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі.

За высокую культуру гандлю харчовымі таварамі.

Аб'екты аграпрамысловага комплексу — ударныя будоўлі краіны.

Пераўтварэнне Нечарназем'я — справа ўсіх саюзных рэспублік.

Удасканальваць кіраванне сельскагаспадарчай вытворчасцю.

Высокакваліфікаваныя кадры ў вёсцы — наш залаты фонд.

Моладзь — вялікая сіла ў вёсцы.

Маладыя гаспадары зямлі.

Аграпрамысловыя аб'яднанні і іх задачы.

Калгасы і саўгасы — фундамент усёй сельскагаспадарчай вытворчасці.

Дзяржаўная дапамога калгасам і саўгасам.

Гаспадарчы разлік— абавязковая ўмова ўздыму эфектыўнасці сельскай гаспадаркі.

Брыгадны і калектыўны падрад — у галіны аграпрамысловага комплексу.

Паляпшаць сістэму аплаты працы ў калгасах і саўгасах.

Натуральная аплата — важная форма матэрыяльнага стымулявання.

Эканомія і беражлівасць — састаўная частка Харчовай праграмы.

Зберажом усё, што вырашчана.

Беражлівыя адносіны да прадуктаў, іх эканомія—прык-

# 100 СЭРЦАМ СЛУЖЫЎ НАРОДУ

Якуб Колас і публіцыстыка... У гэтых словах заключаецца пачатак шматграннай дзейнасці народнага паэта Беларусі Якуба Коласа. Пра час уступлення ў літаратуру ўспамінае сам паэт у аўтабіяграфіі, напісанай 14 мая 1939 года: «1906 год — год майго выступлення ў беларускай газеце са сваімі першымі вершамі на беларускай мове. Упершыню ў гісторыі беларускай літаратуры выйшла беларуская газета «Наша доля» ў 1906 г. Яна праіснавала нядоўга — вышла ўсяго 6 нумароў і была закрыта. Замест яе стала выдавацца другая газета «Наша ніва», больш умераная. З таго часу я пачаў сістэматычна працаваць у газеце, дасылаючы туды свае вершы і апавяданні. Сувязь мая з газетай парушылася ў час майго заключэння ў крэпасці, але пісаць я не пераставаў і сувязь сваю з беларускімі выданнямі ўзнавіў, калі выйшаў з крэпасці».

На працягу ўсёй сваёй творчай дзейнасці Якуб Колас не парываў сувязей з газетай. Таленавіты паэт, празаік і драматург, ён разам з гэтым праявіў сябе і глыбока назіральным, удумлівым і палымяным публіцыстам.

Яшчэ ў дарэвалюцыйныя гады разам з вершамі і апавесцямі Колас змяшчаў у друку свае нататкі і артыкулы, у якіх заклікаў сялянскія масы на барацьбу супраць прыгнятальнікаў. Дарэвалюцыйная публіцыстыка Якуба Коласа выкрывала самадзяржаўе як уладу прыгнятальнікаў, растлумачвала, што паны і капіталісты з'яўляюцца аднолькавымі эксплуататарамі, якой бы яны нацыянальнасці ні былі.

Пасля Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі творчая дзейнасць Якуба Коласа напоўнілася новым зместам. У сваіх шматлікіх публіцыстычных выступленнях на старонках рэспубліканскага і саюзнага друку — артыкулах і нарысах, фельетонах і нататках Якуб Колас актыўна прапагандаваў новае і жорстка ганьбіў аджыўшае, старое. Народны паэт з першых гадоў савецкай улады у сваіх выступленнях палымяна заклікаў да глыбокага вывучэння вопыту ўсіх творчых работнікаў, паказваючы ім сапраўдны прыклад у рабоце як сваёй мастацкай творчасцю, так і публіцыстычнымі выступленнямі. Гэта артыкулы і нарысы аб індустрыяльным развіцці Беларусі, аб сацыялістычным пераўтварэнні вёскі, аб будаўніцтве гарадоў.

У сярэдзіне 30-х гадоў Якуб Колас падымае свой гнеўны голас публіцыста супраць фашызму, пілсудчыкаў у Заходняй Беларусі, за захаванне міру ва ўсім свеце.

У гады Вялікай Айчыннай вайны публіцыстычная творчасць народнага паэта стала асабліва дзейснай. Яго палымяныя публіцыстычныя заклікі, якія звалі на бязлітасную барацьбу супраць ворага, чытаў прыгнечаны народ акупіраванай Беларусі, чыталі іх у партызанскіх атрадах, воіны на франтах Вялікай Айчыннай вайны, працоўныя савецкага тылу. Яны гучалі з трыбуны народных мітынгаў, са старонак газет і лістовак, перадаваліся па радыё.

Больш дзесяці гадоў пасля вайны Якуб Колас выступаў з артыкуламі, прысвечанымі аднаўленню народнай гаспадаркі, пытанням росту мастацкай літаратуры, барацьбе за мір. Сярод іх артыкулы аб новым пяцігадовым плане, аб будаўніцтве гарадоў, заклікі да ўздыму калгаснай вёскі, — аб усім тым, як трэба будаваць новае жыццё.

Артыкулы Якуба Коласа — мастака і публіцыста — малююць цудоўныя перспектывы нашага заўтрашняга дня — камунізму. Магутная сіла коласаўскай публіцыстыкі ў глыбокай ідэйнасці і партыйнасці, у тым, што яна ніколі не адрывалася ад яго мастацкай творчасці, а заўсёды дапаўняла яе. «Дарога партыі — мая дарога...» — з гонарам пісаў паэт. Ён усімі сваімі сіламі, усім сэрцам служыў працоўнаму народу. У гэтым сэнс яго жыцця і сакрэт нягаснучай славы яго таленту — літаратурнага і публіцыстычнага.

**А. ВЛАСАЎ,**
**асістэнт кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства.**

# ПЕСНЯРАМ СЯМ'І АДЗІНАЙ

Творчасць карыфеяў беларускай літаратуры Янкі Купалы і Якуба Коласа сёння шырока вядома не толькі на радзіме песняроў — у Беларусі, але і далёка за яе межамі. Асаблівая любоў і павага да выдатных сыноў зямлі беларускай на Украіне, з народам якой самымі цеснымі сувязямі быў звязаны гістарычны лёс беларусаў і лёс яе шматлікіх майстроў слова. Купала і Колас — найбольш яскравыя прадстаўнікі сапраўднай сардэчнай дружбы з пісьменнікамі братняга народа, іх творчыя кантакты з украінскімі літаратарамі — адна з яркіх старонак у летапісу стварэння шматнацыянальнай сацыялістычнай літаратуры Краіны Саветаў.

Сведчаннем глыбокай пашаны класікаў беларускай літаратуры з'явілася нядаўна праведзеная ў Сумскім педінстытуце імя А. С. Макаранкі навуковая канферэнцыя «Янка Купала, Якуб Колас і Украіна», арганізаваная кафедрамі літаратур гэтай ВНУ. Гэтая — пятая па ліку — канферэнцыя па пытаннях украінска-беларускіх літаратурных і фальклорных сувязей, прысвечаная 60-годдзю ўтварэння СССР, была надзвычай адметнай у параўнанні з ранейшымі. Чатыры папярэднія канферэнцыі, якія прайшлі ў Гомелі, Львове і Сумах у 1969, 1972, 1976 і 1981 гадах, вызначаліся шырокім колам абраных праблем, тэматычнай нерэгламентаванасцю.

Іншы характар мела сёлетняя канферэнцыя. Яна супала з падрыхтоўкай да стагоддзя з дня нараджэння волатаў беларускай літаратуры, творчасць якіх арганічна знітавана з духоўнай культурай многіх савецкіх народаў, у першую чаргу — рускіх і украінцаў. Таму не выпадкова, што праблематыка дакладаў і паведамленняў была скіравана на асвятленне творчых сувязей вялікіх беларускіх пісьменнікаў з Украінай.

У канферэнцыі прынялі ўдзел не толькі выкладчыкі педінстытутаў і універсітэтаў Украіны і Беларусі, але і мастацтвазнаўцы, супрацоўнікі музеяў, літаратары з Кіева і Мінска, Львова і Брэста, Харкава і Гомеля, Сум і Драгобыча... Гомельскі дзяржаўны універсітэт прадстаўлялі кандыдаты філалагічных навук В. Смыкоўская, У. Каваленка, В. Ярац і выпускнік аспірантуры М. Воінаў, якія падрыхтавалі даклады аб перакладах Янкі Купалы і Якуба Коласа з украінскай літаратуры, аб ролі Т. Р. Шаўчэнкі ў станаўленні Купалы і Коласа як паэтаў і аб іхнім удзеле ў падрыхтоўцы першага беларускага выдання «Кабзара».

У прасторнай зале інстытута, дзе сабраліся дакладчыкі і студэнты, увагу кожнага выклікала мастацкае палатно з вобразамі Купалы і Коласа — сяброў і паплечнікаў, стваральнікаў новай беларускай літаратуры. Аўтар гэтай работы — студэнт філалагічнага факультэта мясцовага інстытута Аляксей Перацецкі. Яе вырашана перадаць у адзін з літаратурных музеяў Беларусі.

Уступным словам і дакладам «Значэнне, стан і задачы высвятлення сувязей Янкі Купалы і Якуба Коласа з Украінай» канферэнцыю адкрыў старшыня яе аргкамітэта, доктар філалагічных навук, прафесар Сумскага педінстытута П. Ахрыменка. З цікавымі, змястоўнымі дакладамі выступілі ўкраінскія вучоныя У. Дарашэнка, М. Шалата, В. Манчанка, В. Вартанава, А. Грызун і іншыя.

Дацэнт Драгобыцкага педінстытута М. Шалата паведаміў, што ў Закарпацці быў аб'яўлены конкурс на лепшыя песні на словы Купалы і Коласа, у якім прынялі ўдзел многія прафесійныя і самадзейныя кампазітары, і перадаў некаторыя песні аргкамітэту канферэнцыі. Сярод іх — творы кампазітараў Уладзіміра Флыса, Сцяпана Стэльмашчука, Міколы Ластавецкага, Рамана Саўяка на вершы Я. Купалы і Я. Коласа «Памяці Шаўчэнкі», «Над ракою ў спакоі», «Над калыскай», «Радасць».

Навуковая канферэнцыя ў Сумах з'явілася яскравым пацвярджэннем шчырай любові братняга народа да класікаў беларускай літаратуры.

**В. ЯРАЦ,**
**член Саюза пісьменнікаў СССР, кандыдат філалагічных навук.**

## РАНГАМ ВЫШЭЙ

Аматарам спорту добра вядома імя старшага выкладчыка факультэта фізвыхавання ГДУ Уладзіміра Кузьміча Паўлючкова. У мінулым ён быў выдатным веслярам, а цяпер з'яўляецца вопытным трэнерам і суддзёй па веславанню на байдарках і каноэ. Нядаўна Спорткамітэт СССР прысвоіў У. К. Паўлючкову званне суддзі ўсесаюзнай катэгорыі.

# УСЕНАРОДНАЯ

мета высокай культуры спажывання.

Будзем берагчы і эканомна расходаваць хлеб, усе прадукты харчавання.

Стратам прадуктаў харчавання — надзейны заслон!

Прадпрыемствам і будоўлям — падсобныя гаспадаркі.

Гаспадарка асабістая — карысць агульная.

Асабістую падсобную гаспадарку — кожнай сельскай сям'і.

Далейшае развіццё ўнутрыкалгаснай дэмакратыі.

Наш уклад у рэалізацыю Харчовай праграмы.

Майскі Пленум ЦК КПСС аб знешнеэканамічных сувязях.

Шасцімільённая армія сельскіх камуністаў — магутная сіла.

Вышэй баявітасць пярвічных партыйных арганізацый.

Галоўная задача партарганізацый — работа з людзьмі.

Адзінства арганізатарскай і ідэалагічнай работы.

Райкомы партыі — цэнтры палітычнага кіраўніцтва.

Удасканальваць арганізатарскую і ідэйна-выхаваўчую работу.

Удзел у рэалізацыі Харчовай праграмы — справа гонару прафсаюзаў.

Харчовая праграма — выдатнае поле для прыкладання энергіі камсамольцаў і моладзі.

Сацыялістычнаму спаборніцтву ў аграпрамысловым комплексе — шырокі размах.

Разрадка міжнароднай напружанасці, раззбраенне — патрабаванне часу.

Захаваем і ўмацуем мір.

Паспяховае выкананне нашых стваральных планаў — важная перадумова ўмацавання міру.

Добрасумленнай працай умацоўвай магутнасць Радзімы!

Азнаменуем першы год рэалізацыі Харчовай праграмы высокімі вынікамі.

Выканаем і перавыканаем дзяржаўныя планы закупак сельскагаспадарчай прадукцыі ў 1982 годзе.

65-й гадавіне Вялікага Кастрычніка, 60-годдзю СССР — дастойную сустрэчу!

Рашэнні майскага Пленума ЦК КПСС — выканаем!

# АБ'ЕКТЫЎНАЯ АЦЭНКА ПРАЦЫ

На сходзе прафсаюзнага актыву універсітэта была адобрана сістэма арганізацыі ўліку работ і ацэнкі дзейнасці канкрэтнага работніка, якая прымяняецца на кафедры эканомікі працы.

Ацэнка дзейнасці асобнага работніка і работы кафедры ў цэлым толькі тады будзе аб'ектыўнай, калі будуецца на пэўным масіве інфармацыі. Масіў павінен быць так арганізаваны, каб можна было выдзеліць любую неабходную і дастатковую частку інфармацыі для адказу на канкрэтнае запытанне структурных падраздзяленняў. Звычайна гэтымі ўласцівасцямі валодаюць спецыяльна арганізаваныя картатэкі.

Картатэка нашай кафедры складаецца з 31 карткі і падзелена на тры раздзелы: вучэбная і вучэбна-метадычная работа (11 картак); навукова-даследчая работа (10 картак); грамадска-палітычная работа (10 картак). Такое раздзяленне адпавядае кірункам агульнауніверсітэцкага ўліку і падвядзенню вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва на кафедры, факультэце і ва універсітэце ў цэлым.

Інфармацыя на картачцы арганізуецца такім чынам, каб можна было групаваць яе па тэрмінах выканання, выканаўцам і відах работ. Акрамя таго, уводзяцца спецыяльныя прыкметы, напрыклад, колькасць друкаваных аркушаў апублікаваных артыкулаў. Картка дазваляе скараціць час на атрыманне дакладнай інфармацыі для складання разнастайных даведак і справаздач (бягучых, гадавых, пяцігадовых), ацаніць работу асобнага супрацоўніка, яго ўклад у агульныя вынікі, дасягнутыя кафедрай.

Картатэка ўкаранёна ў 1977 годзе і апраўдвае сябе ўжо на працягу 6 гадоў. Раней работа кафедры ацэньвалася ў цэлым, без выдзялення ўкладу асобнага супрацоўніка. Безумоўна, меркаванне аб актыўнасці супрацоўніка фарміравалася і тады, але без параўнальнай, колькаснай ацэнкі. Магчымы былі памылкі. На кафедры абагулілі вопыт ацэнкі творчай актыўнасці супрацоўнікаў Інстытута механікі металапалімерных сістэм АН БССР і распрацавалі бальныя адзнакі па асобных відах работ.

Для падвядзення вынікаў асабістых сацыялістычных абавязацельстваў і ацэнкі ўклада кожнага работніка зараз прымяняецца 45 паказчыкаў, якія адлюстроўваюць усе бакі дзейнасці работніка ВНУ. Ацэнка асабістага гадавога ўклада вагаецца ад 9 да 102 балаў. Для кожнага супрацоўніка яна дынамічная па гадах, але мае тэндэнцыю да павелічэння у актыўных работнікаў. Той жа супрацоўнік, які ў апаратыўнай мітусні забывае ацаніць сябе аб'ектыўна, спасылаючыся на занятасць, да гадавога фінішу праходзіць з 9 баламі.

Структура паказчыкаў утрымлівае ацэнку апаратыўнай работы (падрыхтоўка артыкула, манаграфіі, дысертацыі, даклада) і выніка работы за папярэднія перыяды (абарона дысертацыі, апублікаванне артыкула, узнагарода, выстаўка).

Упершыню мы падводзілі вынікі асабістага ўкладу ў 1978 годзе. Некаторыя супрацоўнікі былі незадаволены, таму што параўнальныя вынікі паказалі іх сапраўдны ўклад у агульную справу. Прыйшлося зірнуць на сябе з боку і крытычна. Загадчык кафедры атрымаў аргументы для аб'ектыўнай ацэнкі дзейнасці супрацоўнікаў.

Адбыліся змены і ў самой форме сацыялістычных абавязацельстваў. Раней яны афармляліся ў выглядзе плана з пералікам работ без тэрмінаў іх выканання, выканаўцаў. Цяпер гэта рабочая табліца, у якой адлюстраваны і тэрміны, і выканаўцы, робіцца ацэнкі аб выкананні абавязацельстваў.

На мой погляд, сістэма, якая дзейнічае на кафедры эканомікі працы, дазваляе рабіць ацэнку дзейнасці таго ці іншага супрацоўніка комплексна, аб'ектыўна, падводзіць вынікі работы кафедры ў цэлым, складаць любую справаздачу, даведку з найменшымі затратамі часу.

**Э. ЛІЗАРАВА,**
**старшы навуковы супрацоўнік кафедры эканомікі працы.**

*Нашы юбіляры*

# ДАСЛЕДЧЫК ТАЯМНІЦ ПСІХАЛОГІІ



Настаўнікі школ Гомельшчыны і нашай рэспублікі добра ведаюць і паспяхова выкарыстоўваюць у сваёй практычнай рабоце кнігі і артыкулы кандыдата псіхалагічных навук, дацэнта кафедры педагогікі і псіхалогіі Мікалая Іосіфавіча Мурачкоўскага, у якіх ён папулярна і даступна раскрывае тыповыя асаблівасці вучняў, праяўляемыя ў вучэбнай дзейнасці. Мікалай Іосіфавіч сам у мінулым быў педагогам. Яго працоўная дзейнасць пачалася больш чвэрці стагоддзя таму назад. Пасля заканчэння аддзялення логікі і рускай мовы Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна ён на працягу сямі гадоў працаваў настаўнікам, завучам і дырэктарам школы. Ужо тады М. І. Мурачкоўскі праявіў схільнасці да навуковых даследаванняў. У 1962 годзе ён паступіў у аспірантуру Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага. Пасля яе заканчэння паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю і 12 гадоў выкладаў агульную і педагагічную псіхалогію ў Гродзенскім дзяржаўным педінстытуце.

З 1977 года дацэнт М. І. Мурачкоўскі працуе на нашай кафедры педагогікі і псіхалогіі. За гэты перыяд ён зарэкамендаваў сябе здольным лектарам і дапытлівым даследчыкам праблем педагагічнай псіхалогіі. Мікалай Іосіфавіч чытае курс лекцый па агульнай псіхалогіі, вядзе спецкурс па педагагічнай псіхалогіі, кіруе дыпломнымі работамі і педагагічнай практыкай студэнтаў. Кожную сваю лекцыю ён імкнецца насыціць новымі ідэямі псіхалагічнай навукі, надаць ёй практычную накіраванасць. Асабліва шмат увагі звяртае вучоны на павышэнне зместу і метадычнага ўдасканалення практычных заняткаў па псіхалогіі. Ён вядзе плённую даследчую работу. За апошнія гады ім апублікавана манаграфія і больш 20 артыкулаў у рэспубліканскіх і усесаюзных выданнях.

М. І. Мурачкоўскі пастаянна імкнецца ўмацоўваць сувязь з вучэбна-выхаваўчымі установамі, органамі народнай асветы. У сааўтарстве з настаўніцай адной са школ Н. І. Тамарынай ён падрыхтаваў кнігу «Тыповыя асаблівасці навучання малодшых школьнікаў». Адначасова працягвае работу над кнігай «Тыповыя асаблівасці на навучання падлеткаў і старэйшых школьнікаў».

М. І. Мурачкоўскі часта выступае з лекцыямі і дакладамі перад настаўнікамі і насельніцтвам. Ён з'яўляецца рэктарам універсітэта педагагічных ведаў, чытае курс «Сацыяльная псіхалогія» ва універсітэце марксізму-ленінізму.

Мікалай Іосіфавіч — выдатнік народнай асветы БССР. За калектыўную манаграфію «Псіхалагічныя праблемы непаспяховасці школьнікаў» яму прысуджана прэмія Акадэміі педагагічных навук СССР. Гэта манаграфія перакладзена на нямецкую, польскую і чэшскую мовы.

Калегі, студэнты універсітэта горача віншуюць Мікалая Іосіфавіча з пяцідзесяцігоддзем з дня нараджэння, жадаюць яму моцнага здароўя і вялікіх поспехаў у яго навуковай і педагагічнай дзейнасці.

**І. ХАРЛАМАЎ,**
**загадчык кафедры педагогікі і псіхалогіі, член-карэспандэнт АПН СССР.**
**Л. СЕЧКА,**
**партгрупорг кафедры, кандыдат педагагічных навук.**

# КРОКІ ДА ПРАФЕСІІ

Прайшло паўгода з таго часу, як мы ўпершыню пераступілі парог Гомельскага дзяржаўнага універсітэта. Той дзень надоўга застанецца ў нашай памяці, як самы шчаслівы і радасны. Для нас усё тут было ўпершыню: знаёмства з выкладчыкамі, з рабятамі, заняткі ў вышэйшай навучальнай установе, першыя нясмелыя і не заўсёды ўдалыя адказы, адзнакі... А цяпер універсітэт для нас — другі дом, дзе ўсё стала родным і блізкім. На падрыхтоўчым аддзяленні мы рыхтуемся стаць студэнтамі, а потым — выкладчыкамі рускай мовы і літаратуры.

Літаратура і мастацтва — два блізкія словы. Быць сапраўдным педагогам-літаратарам, спазнаць поўныя таямніц душы нашых будучых вучняў — вялікае мастацтва. І на падрыхтоўчым аддзяленні мы рыхтуемся да гэтага. Каб стаць духоўна багатымі людзьмі, дзяліцца потым гэтым багаццем са сваімі вучнямі, нам трэба ўжо цяпер набываць вялікі духоўны багаж. У нас адбылася сустрэча з актрысай абласнога драматычнага тэатра Г. І. Анчышкінай-Каменскай. Пасля мы паглядзелі спектакль з яе ўдзелам. Мы падрыхтавалі і правялі ў групе гутаркі «Мастацтва Пікасо і яго карціна Герніка», наведалі выстаўку карцін рускіх мастакоў другой паловы XIX стагоддзя з фондаў Трэцякоўскай галерэі, выпусцілі фотабюлетэнь «Абуджэнне лесу», прысвечаны 150-годдзю з дня нараджэння вялікага рускага мастака І. І. Шышкіна. У інтэрнаце, дзе мы жывём, таксама правялі гутаркі «Нішто так дорага не цэніцца і так танна не каштуе нам як ветлівасць», «Выхаваць у сабе выхаванасць. Як гэта зрабіць?», «Музыка ў жыцці У. І. Леніна», «Эстрадная музыка і ўплыў яе на маральнае фарміраванне моладзі». Гэтыя гутаркі — першыя выступленні А. Брэля, С. Трошка, А. Жыўняка, А. Лукашэнка перад аўдыторыяй. Зразумела, нялёгка было рабятам выступіць так, каб зацікавіць слухачоў, пакінуць у іх душах глыбокі след. Але ім гэта ўдалося! Узнікалі цікавыя пытанні, спрэчкі, пачутае горача абмяркоўвалася.

Усю сваю кемлівасць, фантазію праявілі нашы рабяты, калі рыхтавалі фотабюлетэнь «Інтэрнат — твой дом».

А самая яркая і памятная падзея ў нашым жыцці — знаёмства з нашай будучай прафесіяй педагога. Мы наведалі СШ № 21 горада, дзе сустрэліся з дэлегатам XXIX з'езда КПБ, заслужанай настаўніцай БССР, дырэктарам гэтай школы Верай Іванаўнай Лазаравай. Гэта сустрэча надоўга застанецца ў нашых сэрцах. Яна дапамагла наглядна ўявіць нам сваю будучую прафесію з усімі яе цяжкасцямі і радасцямі. Нас запрасілі на ўрок рускай літаратуры ў шостым і дзевятым класах. Потым мы разам з Верай Іванаўнай, нашым куратарам, выкладчыцай рускай мовы і літаратуры Ганнай Адамаўнай Чыжык зрабілі аналіз урока. Наведанне школы, знаёмства з яе атмасферай прымусіла нас задумацца над многім: каб дабіцца ў сваёй будучай рабоце высокіх вынікаў, трэба шмат працаваць над сабой. Таму наша самая галоўная і асноўная задача — карпатлівая, настойлівая вучоба.

Наша група ў сацыялістычным спаборніцтве на падрыхтоўчым аддзяленні заняла першае месца. Гэта нас радуе, і, безумоўна, да многага абавязвае. Каб апраўдваць званне пераможцаў, нам неабходна ўзяцца за работу з падвоенай энергіяй. Усе нашы рабяты стараюцца падысці да экзаменаў толькі з добрымі і выдатнымі адзнакамі, паспяхова здаць іх і першага верасня ўліцца ў дружную студэнцкую сям'ю універсітэта.

**А. ФІБІК, Л. ШЧАРБАКОВА, І. ШЭПЯЛЕЎСКАЯ,**
**слухачы падрыхтоўчага аддзялення спецыяльнасці руская мова і літаратура.**



**Шмат цікавага пазнаюць на практычных занятках будучыя геолагі.**

**НА ЗДЫМКУ: вывучэнне мінерала.**

# НАШЫ ЭМОЦЫІ

Трэба навучыцца кіраваць сваімі эмоцыямі. Людзі ўраўнаважаныя больш спакойна рэагуюць на ўсякія «удары лёсу». Ураўнаважаным можа стаць амаль кожны, умацоўваючы нярвовую сістэму, зберагаючы яе ад дрэнных уплываў. Спосабы трэніроўкі нярвовай сістэмы старыя як свет — гэта сістэматычныя заняткі фізкультурай, паўнацэнны сон, які ўзнаўляе раўнавагу нават пасля доўгага і моцнага launcher ператамлення.

Слова з'яўляецца іншы раз мацнейшым эмацыягенным фактарам. Недарэчна зробленая заўвага аб дрэнным у адносінах здароўя выглядзе чалавека з лёгкаадчувальнай нярвовай сістэмай можа прывесці да страху. Так жа можа ўздзейнічаць хаця і справядлівая, але грубая заўвага начальніка падначаленаму. І, наадварот, добрае слова, ветлівыя адносіны, падбадзёрваючыя заўвагі могуць аказаць добратворны ўплыў на псіхіку не толькі здаровага чалавека, але і хворага.

Таму так важна падтрымліваць нармальныя ўзаемаадносіны з людзьмі, выхоўваць у сабе нецярпімасць да грубасці, сварак.

# ЦУДАДЗЕЙНЫЯ РАСЛІНЫ

Многія пазбягаюць ужываць часнок, з-за яго спецыфічнага паху і няведання яго вялікіх лячэбных уласцівасцей. Часнок багаты фітанцыдамі, якія валодаюць вялікай здольнасцю ўнутранай дэзінфекцыі.

З часнаку вучонымі дабыта бясколерная вадкасць (аліцын), якая ў растворы пэўнай канцэнтрацыі затрымлівае размнажэнне бактэрый. З часнаку выпрацоўваюцца прэпараты, якія рэкамендуюцца ўрачамі хворым пры атэрасклярозе, захворванні стрававальных органаў, у выпадках хранічнай дызентэрыі. Сок часнаку ўжо з даўніх часоў прымяняюць для ўзнаўлення жывой тканкі. Долька часнаку, прыкладзеная на нарыў, можа добра здымаць боль і паскараць выздараўленне. Для таго, каб пры ўжыванні сырога часнаку менш адчуваўся яго спецыфічны пах, часнок трэба размяльчыць і праглынуць, запіўшы халоднай вадой.

Не ўсе таксама правільна ацэньваюць значэнне цыбулі, і не ўсім вядомы самыя разнастайныя спосабы яе ўжывання. Яшчэ ў старыя часы цыбуля прымянялася ў медыцыне, потым пра яе забыліся, і толькі ў апошнія дваццаць гадоў яна зноў заняла ў народнай медыцыне сваё дастойнае месца. Вучоныя атрымалі з яе рэчыва, раствор якога знішчае асобныя мікробы.

З цыбулі рыхтуюць лячэбны прэпарат, які ўжываецца пры атэрасклярозе, лячэнні кішэчных і іншых захворванняў. Пры хваробе нырак гэты сродак не рэкамендуецца: ён можа выклікаць запаленне.

Зялёная цыбуля — добры сродак ад стомы, прычым вельмі эфектыўны. Рэкамендуецца ўжываць зялёную цыбулю ў час эпідэміі грыпу, для дэзінфекцыі горла. Пры запаленні дзяснаў можна нацерці іх разрэзанай цыбуляй, ужываць яе ў ежу як мага больш.

Сіроп з цыбулі дапамагае пры кашлі. Яе трэба нарэзаць на кружочкі, пасыпаць цукрам і ўжываць прыкладна праз 12 гадзін.

Цыбуля спыняе нават самы моцны насмарк. Для гэтага дробна нарэзаную цыбулю паліваюць сталовым воцатам (крыху разбаўленым вадой) і даюць некалькі гадзін адстаяцца. Пасля гэтага запалку з ватай абмакваюць у вадкасць і некалькі разоў у дзень змазваюць у носе.

**І. СЯРОГАЎ,**
**старшыня таварыства Чырвонага Крыжа універсітэта.**

*На кніжную паліцу*

# ПАКЛАПАЦІЦЦА ТРЭБА ЗАГАДЗЯ

Рэспубліканскія выдавецтвы «Беларусь», «Вышэйшая школа», «Наука и техника» распаўсюджваюць тэматычныя планы выпуску літаратуры на 1983 год.

Выдавецтва «Беларусь» запланавала выпусціць кнігі па актуальных пытаннях палітыкі КПСС і Савецкай дзяржавы. У серыі «XXVI з'езд КПСС рашыў — зроблена!» выйдзе зборнік матэрыялаў, артыкулаў і нарысаў «Савецкая Беларусь у 11-й пяцігодцы», дзе расказваецца аб поспехах працоўных Беларусі ў выкананні планаў другога года адзінаццатай пяцігодкі. Яшчэ адна серыя «Палітыка КПСС — увасабленне ленінізму» прысвячаецца важнейшым напрамкам сацыяльнай праграмы, выпрацаванай XXVI з'ездам КПСС, раскрыццю сутнасці савецкага ладу жыцця і сапраўднага народаўладдзя. Запланаваны выдавецтвам і выпуск серыі «З вопыту ідэалагічнай работы» для прапагандыстаў, лектараў, выкладчыкаў, універсітэтаў марксізму-ленінізму, работнікаў партыйных камітэтаў, для партыйных і камсамольскіх актывістаў. Серыя «Эканоміка для ўсіх» разлічана на шырокае кола чытачоў. У ёй папулярна раскрываюцца паняцці рэжыму эканоміі і гаспадарчага разліку, іх роля ў павышэнні эфектыўнасці грамадскай вытворчасці ў святле задач, пастаўленых XXVI з'ездам КПСС, выкладаецца сістэма паняццяў і катэгорый, якія характарызуюць галоўны напрамак сучаснай эканомікі.

Літаратура, якую выпускае выдавецтва «Вышэйшая школа», разлічана на студэнтаў ВНУ, навучэнцаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і прафесіянальна-тэхнічных вучылішчаў, выкладчыкаў. Многія выданні спатрэбяцца і спецыялістам народнай гаспадаркі, шырокаму колу чытачоў.

«Наука и техника» — буйное выдавецтва БССР, якое выпускае навуковую літаратуру, падрыхтаваную ў інстытутах і аддзелах АН БССР, а таксама ў іншых навукова-даследчых установах і ВНУ рэспублікі. Гэта кнігі па гісторыі, філасофіі і сацыялогіі, праву, эканоміцы і палітэканоміі, біялогіі, медыцыне, фізіцы, геалогіі, хіміі, тэхніцы, літаратуры і мове, мастацтву, навукова-папулярная, даведачная літаратура.

У выдавецтве «Наука и техника» выходзяць і 12 перыядычных выданняў: «Доклады АН БССР», «Инженерно-физический журнал», «Журнал прикладной спектроскопии», «Дифференциальные уравнения», «Трение и износ», «Известия АН БССР» (на рускай і беларускай мовах).

Для таго, каб своечасова атрымаць патрэбную кнігу, неабходна ўжо зараз уважліва азнаёміцца з тэматычнымі планамі вупуску кніг на 1983 год кожнага з пералічаных выдавецтваў, зрабіць заяўку, аформіць заказ у кнігарні № 19. Гэта дасць вам поўную гарантыю, што вы атрымаеце неабходную вам літаратуру ў вызначаны тэрмін.

**Е. ГРАБЦЭВІЧ.**

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ и профкомов Гомельского государственного университета (на белорусском языке), Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 2 друк. аркуш. Тыраж 2000 экз.
Наш адрас: вул. Савецкая, 104, п 3-11, т. 56-16-52.

АЗ 20434.